# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 11 лютага 1999 года, чацвер, № 2 (1794)


АФІЦЫЙНА

## УСІХ НАС ПЕРАПІШУЦЬ

З 16 па 23 лютага гэтага года на тэрыторыі Беларусі праводзіцца перапіс народанасельніцтва. Паспяховы вынік гэтай акцыі павінны забяспечыць перапісныя работнікі. На гэты раз іх будзе каля 41 тысячы. Толькі непасрэдным апытаннем павінны займацца 33 тысячы "лічыльнікаў", сярод якіх большасць — студэнты 3-4-х курсаў усіх ВНУ рэспублікі, за выключэннем медінстытутаў. Усе яны, не так даўно здаўшы сесію па асноўным месцы навучання, на гэтым тыдні зноў трымалі экзамен — на падрыхтаванасць да пасады "лічыльніка". А з сённяшняга дня пачынаюць папярэдні абыход давераных ім участкаў.

Чаму прынята рашэнне аб правядзенні перапісу менавіта ў гэтым годзе? Справа ў тым, што яшчэ ў 1994 годзе на Каірскай канферэнцыі па народанасельніцтву ўсім краінам было рэкамедавана правесці падобную акцыю з 1995 па 2004 год. А на тэрыторыі былога Савецкага Саюза перапісы традыцыйна праводзяцца раз на 10 гадоў. Апошні — якраз у 1989 годзе. Дарэчы, Украіна і Расія ад гэтай практыкі адмовіліся па банальнай прычыне: проста не хапае грошай. У нас грошы знайшліся. І хоць ёсць пэўныя прафесійныя праблемы: раней жа метадалагічныя пытанні выпрацоўваліся на ўвесь Саюз у Маскве, — перапіс адбудзецца. І будзе праводзіцца метадам інтэрв'ю.

Пакуль жа самае балючае пытанне для тых, каго апытваюць: "Як вызначыць, што ў дзверы пазваніў менавіта лічыльнік, а не злодзей?" У кожнага афіцыйнага перапіснога работніка павінна быць пасведчанне з гербавай печаткай і подпісам главы адміністрацыі раёна, партфель чорнага колеру з эмблемай перапісу і пашпарт.

*Марына АВЕРКІНА*

## УСЕ НА БАРАЦЬБУ З ГРЫПАМ!

На жаль, каварны вірус грыпу не абмінуў і наш універсітэт. Як паведаміла карэспандэнту "Беларускага універсітэта" фельчар здраўпункта БДУ Вольга Эрнестаўна Пятрова, яшчэ да эпідэміі рабіліся захады, каб зменшыць колькасць захварэўшых. Так, было зроблена 180 прышчэпак. Цяпер, у разгар эпідэміі, такія меры не дзейсныя, таму што для выпрацоўкі арганізмам імунітэту пасля прышчэпкі неабходна каб прайшло як мінімум два тыдні. Па словах Вольгі Эрнестаўны, найбольш да яе звяртаюцца студэнты геаграфічнага факультэта, а таксама тыя, хто жыве ў другім і сёмым інтэрнатах БДУ.

Студэнтам і выкладчыкам застаецца толькі чакаць і рабіць усё магчымае, каб хвароба іх абмінула. Напрыклад, Вольга Эрнестаўна раіць прымаць у прафілактычных дозах такія прэпараты, як рэмантадзін, аксалінавую мазь, інтэрферон, аскарбінавую кіслату (вітамін С). Зразумела ж, не трэба забывацца на самыя простыя і танныя меры — часцей праветрываць пакоі, праводзіць вільготную прыборку, есці ў вялікай колькасці цыбулю, часнык.

*Пра эпідэмію грыпу ў рэспубліканскім маштабе чытайце на 8-й старонцы нумара.*

НАВІНЫ З БІБЛІЯТЭКІ

### Зала інфармацыйнага абслугоўвання запрашае чытачоў

З 12 студзеня 1999 года ў Фундаментальнай бібліятэцы БДУ ( пр-т. Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, 2-і паверх, пакой 231) штодзённа працуе зала інфармацыйнага абслугоўвання.

Тут жа экспануецца новая літаратура: кнігі і перыядычныя выданні, якія паступаюць ў бібліятэку за апошні тыдзень.

Для навукова-даследчай работы зала прапануе базы дадзеных на CD-ROM: па прыродазнаўчых науках база дадзеных "PASCAL" (1987-1997 гады), па сацыяльна-гуманітарных навуках — "FRANCIS" (1984-1996 гады).

Акрамя таго, ёсць магчымасць карыстацца унікальнымі энцыклапедыямі на CD-ROM: "Вялікая энцыклапедыя Кірылы і Мяфодзія" (1997 г.), "Брытаніка", "Біблія" і інш.

*Ж. Т. НЕСЦЕРАВА*

А Ў НАС І А Ў ВАС?

## ПРАКТЫКА — КРУГЛЫ ГОД

Новы праект, які сумесна ажыццяўляюць студэнты факультэта журналістыкі і калектыў рэдакцыі газеты "Чырвоная змена", незвычайным не назавеш. І сапраўды, каму як не студэнтам супрацоўнічаць з маладзёжнай газетай? Але адна справа супрацоўнічаць паасобку і ад выпадку да выпадку, і зусім іншая — кожны месяц рыхтаваць да друку студэнцкі спецвыпуск. Прынамсі, нешта падобнае ўжо існавала ў той жа "Чырвонцы", але дзесяцігоддзе таму, калі сённяшні куратар праекта ад факультэта, Таццяна Уладзіміраўна Падаляк, сама была студэнткай. Тады ініцыятыўная група журфакаўцаў не толькі вяла пастаянныя рубрыкі, але і рыхтавала да друку падрыхтаваныя самімі ж студэнтамі цыклы матэрыялаў. Шкада, што некалькі пакаленняў журфакаўцаў у падтрыманні гэтай традыцыі так і не паўдзельнічалі. Добра, што справа гэтая аднавілася і набыла афіцыйны статус.

Карэспандэнт "Беларускага універсітэта" папрасіў дэкана факультэта журналістыкі Васіля Пятровіча Вараб'ёва і галоўнага рэдактара газеты "Чырвоная змена" Алеся Мікалаевіча Карлюкевіча ахарактарызаваць праект некалькімі словамі.

**Васіль Пятровіч Вараб'ёў, дэкан факультэта журналістыкі:**

— Праект з "Чырвонай зменай" — гэта першая ластаўка. Мы мяркуем зрабіць такія студэнцкія выпускі і з "Рэспублікай", і са "Звяздой", з іншымі рэдакцыямі газет. Ёсць дамоўленасць з тэлебачаннем дазволіць студэнтам факультэта журналістыкі зрабіць сваю праграму. Да таго ж, кіраўнікі такіх сумесных праектаў — рэдактары газет, вядомыя журналісты, якія з'яўляюцца кіраўнікамі студэнцкіх вытворчых практык і груп па журналісцкаму майстэрству. Я думаю, што для студэнтаў — гэта цудоўная магчымасць праявіць сябе на практыцы і набыць вопыт журналісцкай працы.

**Алесь Мікалаевіч Карлюкевіч, рэдактар газеты "Чырвоная змена":**

— Студэнцкі спецвыпуск будзе цяпер выдавацца ў "Чырвонцы" напрыканцы кожнага месяца. І я, безумоўна, задаволены тым, што ў газеты адразу паявілася столькі новых аўтараў. Іх можа быць і больш, бо я ўпэўнены, што аб праблемах моладзі са старонак маладзёжнага выдання павінны гаварыць маладыя. Я нават спадзяюся, што мы разам з факультэтам журналістыкі абвесцім конкурс на лепшую студэнцкую публікацыю. Пераможцаў, зразумела, чакае ўзнагарода. А мы чакаем ініцыятыўных.

***Некаторыя публікацыі, надрукаваныя ў рамках гэтага праекта ў газеце "Чырвоная змена", чытайце на старонках 4-6.***

Аб'явы

## Рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:

**Загадчыкаў кафедраў:** гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, функцыянальнага аналізу, тэарэтычнай механікі і робататэхнікі;

**Прафесараў кафедраў:** тэарэтычнай фізікі, арганічнай хіміі і хіміі ВМЗ, дынамічнай геалогіі, міжнародных адносін, тэорыі функцый, фізікі паўправаднікоў;

**Дацэнтаў кафедраў:** энергафізікі, тэарэтычнай фізікі, атамнай фізікі і фізічнай інфарматыкі, неарганічнай хіміі, арганічнай хіміі і хіміі ВМЗ, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, геадэзіі і картаграфіі, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, гісторыі Расіі, філасофіі і метадалогіі навукі, англійскай мовы, сістэмнага аналізу, вышэйшай матэматыкі, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў;

**Старэйшых выкладчыкаў кафедраў:** геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, медыцынскай падрыхтоўкі;

**Асістэнта кафедры** матэматычнага забеспячэння ЭВМ.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, Белдзяржуніверсітэт, упраўленне кадраў, тэл. 226-59-39.**

*СУСТРЭЧЫ*

# ЗА "КРУГЛЫМ СТАЛОМ" АБ ПРАБЛЕМАХ І ПЕРСПЕКТЫВАХ

Інтэграцыя Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі — гістарычны працэс, які непасрэдна датычыць будучага як нашых народаў у цэлым, так і кожнага чалавека ў прыватнасці. Звязваючы лёс беларусаў і расіян, кіраўнікі дзвюх дзяржаў бяруць на сябе вялікую адказнасць — памылкі недапушчальныя, інакш вялікая ідэя можа быць дыскрэдытавана. Слушную дапамогу ў гэтым акажуць вынікі "круглага стала" "Беларуска-расійскія адносіны: праблемы і перспектывы", які праходзіў у канферэнц-зале факультэта міжнародных адносін 26-27 студзеня пры падтрымцы рэктарата БДУ.

Гэты форум беларускіх і расійскіх навукоўцаў — ужо другі па ліку (першы праходзіў 2-3 лютага 1998 года ў Маскве ў сценах Інстытута міжнародных эканамічных і палітычных даследаванняў Расійскай Акадэміі навук). На гэты раз сярод яго ўдзельнікаў — 16 вядучых спецыялістаў па праблемах беларуска-расійскіх адносін. Беларускі бок прадстаўлялі супрацоўнікі факультэта міжнародных адносін БДУ, Міністэрства замежных спраў Беларусі, Выканаўчага сакратарыята СНД, Інстытута сацыяльна-палітычных даследаванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, Інстытута гісторыі НАН РБ, расійскі — супрацоўнікі Інстытута міжнародных эканамічных і палітычных даследаванняў Расійскай Акадэміі навук: прафесары Б. А. Шмялёў, дырэктар Цэнтра параўнальных палітычных даследаванняў В. І. Дашычаў, старшыя навуковыя супрацоўнікі І. Ф. Селіванава, Ю. І. Сураўцаў, А. В. Шурубовіч, а таксама прафесар Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага універсітэта А. Р. Бухавец.

— Сёння ёсць пэўныя падставы лічыць, што Саюз Расіі і Беларусі даказаў сваю жыццяздольнасць,— сказаў у прадмове прафесар А. В. Шарапа. І сапраўды, відавочныя вынікі крокаў насустрач назіраюцца амаль ва ўсіх сферах беларуска-расійскага супрацоўніцтва, вызначаных у шматлікіх двухбаковых пагадненнях. У эканамічнай сферы гэта рост гандлёвага абароту паміж Беларуссю і Расіяй на 10 працэнтаў, значнае павелічэнне колькасці сумесных прадпрыемстваў і фірмаў (каля 500), рэалізацыя шэрагу сумесных эканамічных праектаў, ажыццяўленне 25 сумесных мэтавых праграм, усталяванне трывалых гандлёва-эканамічных адносін на дагаворнай аснове паміж нашай краінай, абласцямі і асобнымі гарадамі і 50 суб'ектамі Расійскай Федэрацыі, прадастаўленне юрыдычным і фізічным асобам Беларусі і Расіі роўных магчымасцей для ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці на тэрыторыі абедзвюх краін. У мытнай сферы — адмена мытнага кантролю на ўнутраных межах, стварэнне Мытнага камітэта Саюза, дасягненне значнай ступені уніфікацыі мытнага заканадаўства. У палітычнай сферы — фарміраванне наднацыянальных органаў кіравання: Парламенцкі сход, Выканаўчы Савет, Вышэйшы Савет Саюза Беларусі і Расіі, увядзенне інстытута саюзнага бюджэту.

Шмат прэтэнзій было ў удзельнікаў круглага стала да юрыдычнага зместу Дэкларацыі аб далейшым яднанні Беларусі і Расіі, падпісанай 25 снежня мінулага года ў Маскве. Была адзначана невыразнасць фармулёўкі ў дакуменце тэрміна "федэральная дзяржава". Гэта, на думку прафесара БДУ У. Е. Снапкоўскага, стварае небяспеку страты Беларуссю статуса суверэннага ўдзельніка міжнародных адносін і цэласнасці Расійскай Федэрацыі. Таксама не зусім зразумелы прынцып фарміравання наднацыянальных органаў. Прафесар БДУ Ю. П. Броўка выказаў сумненні ў мэтазгоднасці шчыльнай інтэграцыі ў сферы ажыццяўлення адзінай абарончай палітыкі, што можа прывесці да парушэння статуса Рэспублікі Беларусь як нейтральнай дзяржавы. Многія даследчыкі падкрэслілі нераўнамерны, спантанны характар руху краін насустрач, вялікую залежнасць гэтага працэсу ад палітычнай волі і інтарэсаў эліт дзвюх дзяржаў. Праводзячы паралель з мадэллю інтэграцыі Еўрапейскага Саюза, яны палічылі тэрміны выканання некаторых пагадненняў (напрыклад, увядзення адзінай валюты) занадта кароткімі. Ёсць хібы і ў практычным ажыццяўленні дасягнутых дамоўленасцей, у шэрагу выпадкаў назіраецца адыход ад прынятых абавязацельстваў, асабліва з расійскага боку.

Але вучоныя гаварылі не толькі аб праблемах, але і аб перспектывах Саюза Беларусі і Расіі. І тут асаблівую каштоўнасць маюць шматлікія прапановы спецыялістаў. Напрыклад, дацэнт БДУ А. М. Сіроцкі вылучыў шэраг захадаў па паляпшэнню функцыянавання мытнага саюза, сярод якіх — пераход да адзінага мытнага тарыфу, увядзенне адзіных стандартаў да тавараў, адзіных мер па нетарыфным рэгуляванні гандлю, адзінага мытнага банкаўскага валютнага кантролю. Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута міжнародных эканамічных і палітычных даследаванняў Расійскай Акадэміі навук Ю. І. Сураўцаў сфармуляваў неабходнасць уліку пры пабудове саюзнай дзяржавы не толькі эканамічных і палітычных, але і этнічна-культурных фактараў.

Вынікі двухдзённай працы навукоўцаў за круглым сталом атрымалі ўвасабленне ў падагульняючым дакуменце з дзевяці пунктаў, прынятым на заключным пасяджэнні, дзе змешчана ўсё, што непакоіць беларускіх і расійскіх даследчыкаў, і ўсё, з чым звязваюць яны свае спадзяванні.

Правядзенне круглага стала ўжо выклікала грамадскі рэзананс у рэспубліцы. Не абмінулі яго ўвагай радыё і прэса. Зацікаўленасць у выкарыстанні вынікаў мерапрыемства ў практычнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў РБ праявіў новы міністр, віцэ-прэм'ер У. Р. Латыпаў.

Круглы стол паказаў розніцу ў ацэнках і меркаваннях, але адзінства ў галоўным: нашы краіны павінны быць разам. Гэта адпавядае інтарэсам дзвюх дзяржаў і волі народаў, якія не ўспрымаюць адзін аднаго як іншаземцаў. І таму ёсць патрэба ў працягу традыцый рэгулярных сустрэч вучоных, якія павінны стаць "маніторынгам беларуска-расійскіх адносін".

*Леанід ФЯДОТАЎ, студэнт факультэта міжнародных адносін*

САКРЭТ ФІРМЫ

# НАВУКОВА-ФАЛЬКЛОРНАЕ ТАВАРЫСТВА ЗАПРАШАЕ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Ужо некалькі гадоў пры кафедры тэорыі літаратуры і Навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору БДУ існуе Навукова-фальклорнае таварыства. Афіцыйна часам яго ўзнікнення лічыцца май 1997 года, але задума з'явілася раней, у студзені 97-га, калі ўтварыць сваё фальклорнае аб'яднанне вырашылі некалькі студэнтаў філфака, зацікаўленых у навуковым вывучэнні народнай творчасці, разам з выкладчыцай беларускага фальклору Рымай Мадэстаўнай Кавалёвай. Вось іх прозвішчы: Аляксей Чарота, Марына Кавалёва, Таццяна Івахненка, Андрэй Скурко, Марыя Кудрашова, Таццяна Карыцька.

На сённяшні дзень у таварыстве налічваецца сорак чалавек, сярод іх не толькі студэнты, аспіранты, але і выкладчыкі нашага факультэта. Паколькі фактычнымі арганізатарамі таварыства былі студэнты, то і вырашана было выбіраць на пасаду прэзідэнта кандыдатаў са студэнцкага асяроддзя. Зараз прэзідэнцкія абавязкі выконвае Андрэй Скурко, студэнт 4-га курса славянскага аддзялення. Варта адзначыць, што Андрэй пастаянна друкуецца ў часопісе "Першацвет", займаецца перакладамі з украінскай мовы.

Курыруе таварыства дацэнт кафедры тэорыі літаратуры, кандыдат філалагічных навук, член Саюза фалькларыстаў Беларусі Рыма Мадэстаўна Кавалёва. Яна — наша дарадчыца і натхняльніца, заўсёды падтрымлівае ініцыятыву і спрыяе яе рэалізацыі.

Дзейнасць Навукова-фальклорнага таварыства даволі разнастайная. У першую чаргу мы спрабуем выявіць сярод студэнтаў тых, хто неабыякава адносіцца да народнай творчасці, хто мае здольнасці да навуковай дзейнасці і праяўляе пры гэтым цікавасць да вывучэння фальклорнай спадчыны, і дапамагаем ім рэалізаваць творчы патэнцыял.

Члены Навукова-фальклорнага таварыства прымаюць удзел у студэнцкіх (факультэцкіх і рэспубліканскіх) і міжнародных навуковых канферэнцыях, друкуюцца ў перыядычных выданнях, займаюцца падрыхтоўкай метадычнай базы для правядзення фальклорнай практыкі, якую абавязкова праходзяць усе першакурснікі філалагічных факультэтаў.

Хаця таварыства існуе параўнальна невялікі час, тым не менш ужо можна падвесці некаторыя вынікі. Так, напрыклад, на працягу 1997-1998 гадоў члены таварыства падрыхтавалі і выдалі 5 выпускаў "Метадычных указанняў і ілюстрацыйных матэрыялаў да правядзення фальклорнай практыкі студэнтаў 1-га курса філалагічнага факультэта": "Каляндарная абраднасць Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці", "Каляндарна-абрадавая паэзія", "Вясельная абраднасць беларусаў", "Валачобныя песні", "Купальскія песні".

Заўважым, што напрыканцы 1998 года на нашы "метадычкі" прыйшлі запатрабаванні нават з Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

У кастрычніку 1997 года ад нашага таварыства было зроблена дзве заяўкі на ўдзел у конкурсе грантаў для студэнтаў, аспірантаў і дактарантаў БДУ (дзве групы па 6 чалавек). У выніку рэцэнзіравання, якое праходзіла на факультэце журналістыкі і на гістарычным факультэце, адзін з нашых праектаў пад назвай "Усходнеславянскі фальклор: пошукі новых падыходаў" атрымаў 98 балаў за актуальнасць. Такім чынам, наш праект "прайшоў" (а "мы" — гэта аспіранты Таццяна Івахненка, Марына Кавалёва, Алесь Туровіч (кіраўнік праекта), магістранты Вольга Смірнова, Аляксей Чарота, студэнтка 5-га курса Марыя Кудрашова). Дзякуючы фінансавай падтрымцы гранта нам удалося прыняць удзел у пяці навуковых канферэнцыях (з іх 3 — міжнародныя і 2 — выязныя) і падрыхтаваць да друку калектыўную манаграфію "Свет славянскага фальклору", выданне якой запланавана ажыццявіць у 1999 годзе.

Аднак на дасягнутым члены Навукова-фальклорнага таварыства не спыняюцца. У студзені 1999 года былі прапанаваны два новыя праекты на конкурс грантаў: "Міфасфера беларусаў і фальклор" (кіраўнік — аспірантка кафедры тэорыі літаратуры Івахненка Т. А.) і "Жанрава-рэгіянальнае вывучэнне беларускага фальклору" (кіраўнік — аспірантка кафедры тэорыі літаратуры Смірнова В. А.). Канешне, мы вельмі спадзяёмся на перамогу.

І яшчэ адна праблема турбуе членаў нашага таварыства. Як вядома, ужо некалькі год на філалагічным факультэце адчынена славянскае аддзяленне, але да сённяшняга часу няма сучаснай навучальнай літаратуры па славянскаму фальклору, нават перакладзенай. Між тым, на 2-м курсе на ўсіх аддзяленнях чытаюцца на працягу двух семінараў славянскія мовы (па выбару студэнтаў): польская, балгарская, сербская, македонская, чэшская. Наша таварыства прапанавала падрыхтаваць хрэстаматыю па славянскаму фальклору, прыцягнуўшы да супрацоўніцтва выкладчыкаў названых дысцыплінаў, а таксама студэнтаў адпаведных аддзяленняў. Работу над сербскім і польскім раздзеламі хрэстаматыі запланавана пачаць у другім квартале 1999-га года (падчас студэнцкай дыялектычнай практыкі).

Мы запрашаем усіх, каго цікавіць народная культура і хто выказвае жаданне займацца даследаваннем фальклору, падключацца да нас. Таварыства гатова супрацоўнічаць і з камерцыйнымі структурамі. Наш адрас: г. Мінск-50, вул. К. Маркса, 31, аўд. 321 (кафедра тэорыі літаратуры), Навукова-фальклорнае таварыства філалагічнага факультэта.

Сардэчна запрашаем у госці!

*Таццяна ІВАХНЕНКА, аспірантка кафедры тэорыі літаратуры, член Навукова-фальклорнага таварыства*

СПОРТПЛЯЦОЎКА

## ВІНШУЕМ!

Ва універсітэцкіх спаборніцтвах па плаванню сярод супрацоўнікаў БДУ ва ўзроставай групе 40-49 гадоў на дыстанцыі 50 метраў вольным стылем нечакана для многіх перамог выкладчык фізічнай культуры (дарэчы, ён адказвае за факультэт журналістыкі) Саркіс Акопавіч Элчакян.

*Вольга КАЗДЗЕРКА*

ПРАГУЛЯЛІ...




Сур'ёзнымі непрыемнасцямі скончыліся для некаторых студэнтаў геаграфічнага факультэта абыякавыя адносіны да наведвання заняткаў. Нягледзячы на неаднаразовыя папярэджанні дэканата факультэта гэтыя студэнты актыўна ўхіляліся ад сустрэчы з выкладчыкамі на аўдыторных занятках. Аматарам пропускаў заняткаў, а гэта студэнты першага курса Шульга Т. А., Карней А. У., Александрук П. М., студэнты другога курса Заяц Н. П., Вераменка Д. Ю., Сапун В. І., Смірноў Ю. Г., Фёдараў К. В., Журо А. І., Літвінка А. В., Абрагімовіч П. П., Макатун Н. М., Банцэвіч Д. Е., Дворак І. Я., Калеснікаў Ю. А., Шыдлоўская Л. М., Каламіец Н. У., Нікуленка Т. С., і студэнт трэцяга курса Жданаў І. В., у мэтах умацавання вучэбнай дысцыпліны на факультэце аб'яўлена строгая вымова з занясеннем у асабістую справу. Парушальнікаў папярэдзілі, што ў выпадку далейшых падобных грубых парушэнняў правіл унутранага распарадку яны будуць адлічаны з ліку студэнтаў Белдзяржуніверсітэта. Аб перспектывах "вучобы" гэтых студэнтаў у БДУ паведамілі іх бацькам.

*А. САКОЛЬНІК, старшыня савета старастаў БДУ*

# СТУДЭНТ БЕЗ ГРОШАЙ — ГЭТА НЕ МУЖЧЫНА

***— Студэнт без грошай — звычайная з'ява. Зайважце, звычай-ная! — сцвярджаюць студэнткі I курса мехмата БДУ Ганна і Наталля. — Калі стыпендыю траціць толькі на ежу ды кожны дзень марожанае купляць, то яе, мабыць, і хопіць на месяц. А калі хочацца набыць касметыку, схадзіць на дыскатэку ці трэба купіць сяброўцы падарунак да дня нараджэння, то ўжо праз два тыдні даводзіцца прасіць грошы ў бацькоў...***

Сапраўды, на стыпендыю не пражывеш, і таму многія хлопцы і дзяўчаты імкнуцца падзарабіць у вольны ад заняткаў час — хто на што здольны.

Напрыклад, Ганна разносіць часопісы, некаторыя з яе сяброў пры дапамозе бацькоў уладкаваліся ў розныя фірмы, а Наташа марыць знайсці "такую класную высокааплатную працу, дзе будзе працаваць галава, а не рукі": паспрабаваць сябе ў якасці менеджэра ці агента па рэкламе. Хіба што пакуль не адважваецца тыя мары ажыццявіць...

А вось Андрэй — студэнт II курса МТФ БДПА — час ад часу на працягу навучальнага семестра падзарабляе рознарабочым, падсобнікам на будоўлі:

— Кладу цэглу і блокі, мяшаю рошчыну, спрабаваў сябе і стропальшчыкам і зваршчыкам... Неяк з сябрам разгружалі муку... Некаторыя мае знаёмыя ганяюць машыны з Літвы, ва універсітэце з'яўляюцца пад канец семестра і здаюць "хвасты", хтосьці гандлюе на "Дынама" ці Камароўцы... Не ўсіх могуць забяспечыць бацькі, стыпендыя знікае за пяць дзён. Дзіва што: пачак цыгарэт каштуе 150 тысяч, дзве бутэлькі піва — 60, упакоўка чыпсаў — 50. Звычайныя студэнцкія затраты. Добра, калі сам сумленна зарабляеш — можаш спакойна траціць грошы на што пажадаеш, тым больш, што не ўсе бацькі могуць задаволіць патрэбы дарослага ўжо "дзіцяці". Час ад часу разам з бацькамі купляем "рэч у дом". Напрыклад, зараз ёсць задума набыць мікрахвалевую печку.

— Хочаш ведаць, як я падзарабляю? — пытаннем на пытанне адказвае другакурснік інжынерна-эканамічнага факультэта БДТУ Аляксандр. — Уяві сабе: дыскатэка, гардэроб, шум навокал. У гардэробе сяджу я з канспектам. Бо якраз такі час, калі народу мая асоба амаль не патрэбна (уся вопратка здадзена і забіраць яе яшчэ рана). Каб не марнаваць час, спрабую рыхтавацца за заняткаў... Але доўга я там не вытрымаў: набліжалася сесія, і трэба было больш увагі ўдзяляць вучобе...

Працу Саша знайшоў выпадкова, так бы мовіць, "па знаёмстве", але ў яго ёсць сябар, які ўладкаваўся ў "дыскатэчны" гардэроб па аб'яве — некаторым, бывае, шанцуе.

— Студэнт без грошай — гэта не мужчына, — упэўнены Сяргей Дымкоў (мехмат БДУ, IV курс). Таму ўлетку хлопец працаваў на будоўлі, а зараз складае камп'ютэрныя праграмы і адначасова шукае яшчэ якую-небудзь работу. Звяртаўся ў службу занятасці, але пераканаўся, што на біржы працы нічога цікавага, а тым больш грашовага, не прапаноўваюць, а ў газетах — бясконцы "Гербалайф". Але, не зважаючы ні на што, Сяргей упэўнены, што пры жаданні любы студэнт можа знайсці нядрэнны заробак і занятак па душы і здольнасцях.

Яшчэ з першага курса пачаў шукаць працу Віталь Кірута, чацверакурснік з ФПМ БДУ:

— Спачатку ўсё чакаў, што прыйдзе нехта і нешта мне прапануе, а калі актыўна ўзяўся за справу — працу знайшоў даволі хутка.

Увечары пасля заняткаў Віталь вярстае кніжкі ў выдавецтве. Але яму хочацца знасці працу бліжэй да сваёй спецыяльнасці (ён — будучы праграміст), на якую можна было б уладкавацца пасля заканчэння універсітэта.

Валерыя — таксама студэнтка БДУ. Яшчэ са школы пачала супрацоўнічаць з універсітэцкай газетай, а пасля яе залічылі ў штат — за "адказнасць і высокую маральнасць" (так яна сама пра сябе паведамляе). Але...

— Я бегала па факультэтах, збірала інфармацыю, рабіла матэрыялы. Заробак невялікі, работа перашкаджала вучобе, і таму зараз не працую...



Будучая журналістка Марыя — зараз тэхнічны рэдактар.

— Я выпраўляю памылкі ў розных разумных тэкстах,— паведамляе яна. — Чытаю тое, што самой цікава, магчыма, спатрэбіцца ў жыцці, а за гэта яшчэ і грошы плацяць... Жаданне ўладкавацца на працу з'явілася яшчэ на другім курсе. Я вучуся на платным аддзяленні, не атрымліваю стыпендыі. А хацелася мець свае грошы. Акрамя таго, калі працуеш, адчуваеш сябе больш самастойнай, дарослай.

Працягваючы пошукі працуючых студэнтаў, даведалася, што хлопцы і дзяўчаты ў вольны час ператвараюцца ў вартаўнікоў, кур'ераў, сакратароў-рэферэнтаў, настаўнікаў, рэпетытараў, сядзяць за камп'ютэрамі і займаюцца сацапытаннямі... А тым, хто яшчэ не знайшоў працу, яны жадаюць удачы і шматлікіх сяброў (так лягчэй жыць), а галоўнае — упартасці і настойлівасці.

Хто шукае, той заўсёды знаходзіць!

*Алена ДЗЯДЗЮЛЯ*

# АГЛЯД ЖАНІХОЎ,

## альбо Разважанні студэнтаў аб сямейным жыцці

*(Толькі для дзяўчат)*

***Калі вам надакучыла вучыцца і захацелася выйсці замуж, трэба сур'ёзна абдумаць сваё становішча. Спачатку прааналізаваць сітуацыю, улічваючы матэрыяльны фактар, свае знешнія і ўнутраныя якасці, а потым выбраць "ахвяру". Першы пункт даволі лёгкі, затое другі... Дзе той чалавек, якому б можна было даверыць сваю бясцэнную асобу? І ці ёсць такі ўвогуле? Каб зэканоміць ваш час, мы вырашылі правесці сярод студэнтаў экспрэс-апытанне і даведацца пра іх асабістыя планы на будучыню. Вось найбольш тыповыя меркаванні, па якіх вы зможаце вызначыць, дзе шукаць вашу палову.***

Шмат хто з дзяўчат не супраць пакласці вока на якога-небудзь **юрыста**. Папярэджваем: разумніцы могуць не турбавацца. Гэтыя хлопцы аддаюць перавагу прыгожым і паслухмяным. Розум жа, паводле іх асабістага прызнання, жонцы не патрэбен (гэта мужчынская прывілея). Браць шлюб яны збіраюцца не раней чым у 25 гадоў. І тлумачаць гэта тым, што дзяды жаніліся ў 23, бацькі — у 24, а яны толькі працягваюць традыцыю (цікава, што ж будзе з іх нашчадкамі?).

На першым месцы ў юрыстаў — дзеці. Амаль кожны на юрфаку лічыць, што неабходна мець хлопчыка і дзяўчынку (для процідзеяння). Затое пры магчымым разводзе дзеці застануцца з жонкай.

**Міжнароднікам** таксама падабаюцца прыгожыя дзяўчаты з добрымі фігурамі. Калі вам уласцівыя адметнасць і выразнасць, то ёсць шанц ім спадабацца. Міжнароднікі — людзі грунтоўныя: бяруць шлюб у 28 гадоў і то ў экстрэмальных умовах, але калі ажаніліся, наўрад ці развядуцца. Гэта можа здарыцца толькі з прычыны адыходу жонкі ад сямейных спраў і недагляду дзяцей, якіх нашы хлопцы будуць горача любіць і з якімі не расстануцца ні пры якіх умовах (у тым ліку і разводзе). З усіх факультэтаў толькі гэты лічыць, што чым больш дзяцей, тым лепш. Праўда, сваё шчасце яны збіраюцца час ад часу падкідваць бацькам...

Калі вам патрэбны аматары гармоніі, звярніце ўвагу на **фізікаў**. Яны ўсё робяць гарманічна: і гаспадарку, і сям'ю, і дзяцей. На пытанне "Чаму хочаце менавіта дваіх дзяцей?" адказваюць: "Аднаму дзіцяці будзе сумна, а больш, чым двое, — жонцы цяжка". Чаму хлопчыка і дзяўчынку? Зноў жа — дзеля гармоніі. Фізікі ўпэўнены, што сям'я — вялікая адказнасць. Яна патрабуе сталасці, якой, на іх думку, можна дасягнуць у 24 гады. А пакуль гэты час надыдзе, маладыя людзі паспеюць знайсці сабе гаспадарлівую бландзінку, разумовыя здольнасці якой "складуць" 50 працэнтаў ад мужчынскіх. Дарэчы, фізікі на 99 працэнтаў (!) упэўнены ў сваёй "няпадкасці" на іншых жанчын. Праўда (і гэта таксама трэба мець на ўвазе), калі іх слабая палова спакусіцца на кагосьці іншага і здрадзіць, муж не будзе даводзіць справу да разводу, а проста адпомсціць ёй тым самым. У выпадку рознагалосся паміж маці і нявесткай фізфакаўцы падтрымаюць жонку. А пры неабходнасці расстацца — падзеляць нашчадкаў напалам (у выхаванні і матэрыяльным забеспячэнні свайго дзіцяці яны разлічваюць на дапамогу бацькоў).

Калі вы не вызначаецеся нічым асаблівым, звярніце ўвагу на **хіміка**. Тут патрэбна крыху вясёлая, крыху добрая, з пэўнай доляй разумення дзяўчына, магчыма, прыгожая, а ўвогуле — самая звычайная. Матэрыяльны бок хіміка не хвалюе, ён не запатрабуе чагосьці "звыш", але хоча, каб



"усё было спантанна". Для шчасця яму патрэбна двое дзяцей (адзін — мала, тры — многа).

У іншым — меркаванні хімікаў падзяліліся. Адна палова сцвярджае, што наўрад ці здрадзіць жонцы, другая — што ўвесь час толькі гэтым і будзе займацца. Адны кажуць, што на здраду жонкі могуць адрэагаваць па-рознаму (гледзячы, з кім яна гэта зробіць), а другія — што каханая мае права абыходзіцца з імі так, як і яны з ёй (здрада за здраду, і ўсё добра). Першыя мяркуюць, што пры сутыкненні жонкі са свякрухай яны падтрымаюць жонку, другія адказваюць, што проста ўцякуць з дому на пэўны час. Усё тыя ж першыя пакінуць пры разводзе дзяцей сабе, другія — жонцы.

Хлопцы з ФПМІ прынцыпова дачакаюцца 27 гадоў (тры ў кубе) ці наогул не будуць жаніцца. **Матэматыкі** — даволі загадкавыя асобы са спецыфічным пунктам гледжання. Яны п'юць, кураць, гуляюць, але ў той жа час аддаюць перавагу добрым, паводле іх слоў, дзяўчатам: вытанчаным, разумным, крыху дзелавым, сціплым, прыгожым і стройным. (Бач ты, якая патрабавальнасць!) Большасць выказала жаданне мець двух дзяцей, пераважна хлопчыкаў, падобных да дзеда — вельмі ж шануюць продкаў.

У час гутаркі матэматыкі выказвалі розныя думкі, але больш за ўсё здзівілі сваёй патрыярхальнасцю. Усе яны мяркуюць, што мужчына павінен быць галоўным у сям'і і кіраваць жонкай. А пытанне "Ці абавязкова жонцы працаваць?" уразіла іх да глыбіні душы: "Канешне! А хто ж сям'ю карміць будзе?!"

*(Працяг на 6-й стар.)*

# АГЛЯД ЖАНІХОЎ,

## альбо Разважанні студэнтаў аб сямейным жыцці

*(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)*

З вернасцю ў матэматыкаў справы абстаяць наступным чынам:

1. Магчыма і здраджу (гледзячы з кім), а калі жонка такое зробіць — заб'ю і яе, і палюбоўніка на месцы злачынства;

2. Пачатак аналагічны папярэдняму, а наконт жонкі: "Не ведаю, што зраблю, але на развод не пайду, бо яна для мяне — галоўнае".

Цікавыя погляды ў **геафакаўцаў**. Ім здаецца, што найлепшы узрост для шлюбу — 60 гадоў. Маўклівая даўганогая дзяўчына — найлепшы варыянт. (Праўда, невядома, чаму гэта яна паквапіцца на пенсіянера.) Дзяцей выхоўваць павінен сабака, Карлсан, суседзі; адным словам, кожны, толькі не бацька. На першым месцы ў сямейных адносінах геафак ставіць секс. Дапамагаць па дому географы не збіраюцца, пры сварцы сваёй паловы са свякрухай стануць на бок дзяцей.

Наступным сваім меркаваннем географы літаральна знішчылі ўсю мужчынскую годнасць папярэдніх факультэтаў: у адказ на здраду каханай яны збіраюцца вешацца. Пры разводзе ж лічаць больш гуманным пакінуць дзяцей з цешчай.

У пэўнай ступені адрозніваецца ад іншых **журфак**. Тут 25 гадоў — крытычная мяжа. Журналісты цэняць слабую палову чалавецтва, як Оскар Уайльд, які сказаў: "Я люблю мужчын з будучыняй і жанчын з мінуўшчынай". А яшчэ разумных, верных, з пачуццём гумару і сексуальна прывабных. Жаданне мець менавіта двух дзяцей тлумачаць пароznаму:

1. "Большая верагоднасць нарадзіць тое, што трэба".

2. "Адно дзіця ў сям'і хутчэй за ўсё вырасце эгаістам, таму гэты варыянт выключаецца. А забяспечыць і даць паўнацэннае выхаванне можна толькі двум".

Узнікае пачуццё, што будучыя "пісакі" прадумалі свой шлюб да дробязей на 20 гадоў наперад. "Жыць будзем без бацькоў, не ў доме, а менавіта ў кватэры. Раніца пачнецца з сексу, затым — снеданне, а пасля — праца. Увечары — культурны адпачынак і, нарэшце, спатканне з агульнымі сябрамі, бо журналісты — людзі кампанейскія. Дзеці выхоўваюцца так: яе выхаванне плюс маё ўмяшанне. Магчыма, дапамагу па гаспадарцы (што-небудзь згатую). Першыя пяць гадоў мы жывем па плане, потым жонка надакучыць, і я пачну падгульваць. Пры яе здрадзе — заб'ю (калі будзе час). І ўвогуле, здрадзіць яна мне зможа толькі адзін раз".

Не ўмешвацца ў сваркі і заўсёды заставацца "на ўласным баку" — вось іх прынцып.

Самымі сур'ёзна настроенымі з усіх апытаных аказаліся будучыя **псіхолагі** з БДПУ. Амаль на ўсе пытанні яны адказалі: "Гледзячы па магчымасцях і абставінах (якім чынам, дзе, калі, з кім і чаму)". Іх шлюбны тэрмін — 30 гадоў. Ідэал жонкі — разумная і не вельмі брыдкая. Некаторых хвалюе матэрыяльнае становішча. Нашчадка дастаткова і аднаго, тым больш, што мэтай з'яўляецца выхаванне эгаіста: "Можа, ён і будзе дрэнным, але затое яму будзе добра!" Жонка працаваць не павінна, яна павінна "ўкалваць". "Здрада? Так, магчыма. Яна? Лепш, каб я пра гэта не даведаўся..."

Як бачым, да сямейнага жыцця студэнты так ці інакш рыхтуюцца. Таму спадзяёмся, што наш агляд дасць вам пэўны накірунак і дапаможа ў выбары мужа. Пра больш падрабязную інфармацыю раім звяртацца да прадстаўнікоў факультэта, які вам імпануе.

*Валерыя АЎСЯНІК*

---

СЛУЖБА БЯСПЕКІ

# НЕ СКАЧЫЦЕ ПА БАЛКОНАХ, СПАДАРЫ!

***— У інтэрнаце жывецца весела, бо няма ніякага кантролю з боку бацькоў,— з зайздрасцю разважала адна мая знаёмая, штовечар вяртаючыся ў сям'ю — да бацькі і маці. Напэўна, так думае большасць студэнтаў... Там і сапраўды весела, а яшчэ — утульна і спакойна, бо цяпер у інтэрнаце БДУ дзейнічаюць спецыяльныя аператыўныя атрады.***

Хлопцы спартыўнага выгляду працуюць на вахце з 19 да 24 гадзін кожны дзень, а ў святы, здараецца, нават і да трох гадзін начы. Аператыўныя атрады не надта вялікія, напрыклад, у інтэрнаце № 2 гэта ўсяго 23 студэнты, а ў "дзевятцы" і таго менш. Нягледзячы на такую акалічнасць, яны паспяхова спраўляюцца са сваімі абавязкамі. А абавязкі ў іх нялёгкія: акрамя кантролю за наведваннем інтэрната, аператыўны атрад павінен сачыць за парадкам ва ўсім будынку. Для гэтага ў 18 гадзін робіцца агляд паверхаў.

— Парушэнняў з боку студэнтаў хапае,— паведамляе студэнт геаграфічнага факультэта БДУ Аляксандр Карпічэнка,— у асноўным гэта "бурныя" паводзіны пасля 23 гадзін, курэнне ў пакоях, а не ў адведзеных для гэтага месцах, карыстанне электранагравальнымі прыборамі (што забаронена), празмерна шумнае святкаванне з нагоды здачы сесіі ці дня нараджэння. Для падобных мерапрыемстваў у інтэрнатах ёсць спецыяльныя пакоі, і студэнту дастаткова напісаць заяву на імя загадчыка інтэрната, каб весела адзначыць пэўную падзею, не перашкаджаючы іншым...

Нярэдка хлопцы з аператыўных атрадаў "здымаюць" парушальнікаў з балконаў. Да чаго толькі не дадумваюцца студэнцкія галовы, каб абысці вахцёра! Напрыклад, з дапамогай пажарнага шланга або звязаных прасцін спрабуюць... забрацца на другі паверх і нават вышэй...

Аператыўныя атрады павінны выявіць факт парушэння, давёўшы гэта да ведама студэнцкага савета. І там ужо прымаюць рашэнне, як пакараць студэнта. Напрыклад, у інтэрнаце № 2 за дрэнныя паводзіны і пастаянны непарадак у пакоі былі выселены два студэнты радыёфака. Адзначу, што існуе некалькі спосабаў уздзеяння на парушальніка: папярэджанне, потым — папярэджанне і некалькі гадзін "адпрацовак", затым — вымова і, нарэшце, — высяленне. Раней даволі часта ўзнікалі праблемы з замежнымі студэнтамі, але зараз усе падобныя пытанні вырашаюцца адміністрацыйным шляхам праз дэканаты, і оператрадам стала лягчэй дыхаць... Чым жа прываблівае гэтая неспакойная праца студэнтаў, у якіх, як і ў іншых, хапае свайго "галаўнога болю" ў выглядзе лекцый і сесій? Як высветлілася, кожны з іх вызначаецца павышаным пачуццём адказнасці за сябе і тых, хто побач. І хоць прама яны пра гэта не гавораць, але добрасумленнасць і надзейнасць адчуваюцца ў кожным слове і руху супрацоўнікаў (ці сяброў?) аператыўных атрадаў.

Зараз (зноў жа па ініцыятыве саміх студэнтаў) ствараецца дадатковы атрад пры службе бяспекі БДУ, які будзе ўдзельнічаць у ахове шматлікіх культурных мерапрыемстваў універсітэта. Належны спакой і бесклапотнасць сябрам будуць забяспечваць іх аднакурснікі. Цяпер можна ўдакладніць: нашы студэнты — публіка, безумоўна, вясёлая, але, гэтак жа бясспрэчна, сур'ёзная і адказная.

*Кацярына БУРЫК*

# НІ БОЛЬШ НІ МЕНШ, А ДЗЕВЯЦЬ ГАДОЎ

## Крокі ў навуку

Сёлетнія святкаванні дня нараджэння ліцэя БДУ (яму споўнілася не больш ні менш, а дзевяць гадоў) праходзілі ўсяго два дні замест традыцыйных трох. Але ў гэтыя два дні з твараў ліцэістаў, былых і цяперашніх, не сыходзілі ўсмешкі, гучалі смех, жарты, віншаванні.

А пачалося ўсё ў пятніцу 5 лютага з вельмі сур'ёзнай падзеі — V навукова-практычнай канферэнцыі. У рабоце секцый беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры, англійскай мовы, матэматыкі, гісторыі, фізікі, хіміі, біялогіі і геаграфіі, інфарматыкі прымалі ўдзел каля паловы ліцэістаў, якія падрыхтавалі 118 дакладаў. Многія даклады былі унікальнымі. Напрыклад, Наталля Гінёва з 10-га класа прадставіла даклад "Тарас на Парнасе" ў рускім і англійскім перакладзе", Таццяна Фунцікава з 10-га класа закранула такую цікавую тэму, як "Спорт у жыцці пісьменнікаў".

Ужо другі год на навукова-практычную канферэнцыю ў ліцэй БДУ прыязджаюць сябры з Браслава. У гэтым годзе прадставілі свае працы 9 чалавек.

Усё самае лепшае і самае цікавае, што гучала на канферэнцыі, убачыць свет у "Вестнике лицея", а некаторыя даклады па хіміі будуць надрукаваны ў асобным выданні пад назвай "Хімія. Праблемы выкладання".

## Ліцэйская кніжыца

Ужо пяты год запар да свайго дня нараджэння ліцэісты выпускаюць у свет часопіс "Вестник лицея". Часопіс цікавы тым, што ўсе матэрыялы пішуць самі ліцэісты. Да таго ж, яны самі вярстаюць яго і рыхтуюць да друку.

"Вестник лицея" — своеасаблівы летапіс. Тут распавядаецца пра ўсе значныя падзеі з жыцця ліцэя за апошні год — конкурсы і алімпіяды, імёны ўсіх пераможцаў і дыпламантаў.

## Дзень расчыненых сэрцаў

У пятніцу ўвечары ліцэісты сабраліся ў ДК Чыгуначнікаў. На прыступках палаца ўвесь час хтосьці шукаў лішні білецік. На жаль, зала змагла змясціць далёка не ўсіх жадаючых. Бо завітаць на дзень нараджэння ліцэя пажадалі многія выпускнікі. Таму на дзесяцігоддзе арганізатары плануюць адшукаць большую залу.

Вядучыя вечарыны, выдатніца Святлана Баравік і сярэбраны прызёр міжнароднай алімпіяды па хіміі ў Аўстрыі Яўген Пляшэвіч, стварылі пасапраўднаму ўтульную і нязмушаную атмасферу. Гледачы ўвесь час выбухалі смехам, бурна рэагавалі на тое, што рабілася на сцэне.

Нумары рыхтавалі, за маленькім выключэннем, самі ліцэісты. Прадставіў свой танцавальны нумар ансамбль "Глорыя", з захапленнем усе сачылі за танцавальным дуэтам Вольгі Міхалковіч і Паўла Залуцкага. На сцэну выйшла нават дынастыя ліцэістаў: тры сястры Берташ выступілі з іспанскім танцам. Усіх зачаравалі песні пад гітару Алены Сычовай і Таццяны Давыдзюк.

З гасцей прысутнічаў Аляксандр Мікалаевіч Курбацкі, прарэктар па вучэбнай і інфармацыйна-аналітычнай рабоце. Ад імя універсітэта ён узнагародзіў настаўніцу харэаграфіі Вольгу Іванаўну Гусінец і бухгалтара Святлану Мікалаеўну Маслянкову. Ад імя Мінгарвыканкома граматы атрымалі Яўген Яўгенавіч Казлоўскі, настаўнік фізкультуры, Дзітрый Канстанцінавіч Краўцэвіч, настаўнік геаграфіі, настаўніца гісторыі Таццянна Фёдараўна Ходзіна. Таксама былі



узнагароджаны ад імя ліцэя настаўніцы англійскай мовы Наталля Аляксееўна Мудрак і Людміла Мікалаеўна Кецко, медсястра Валянціна Георгіеўна Бадылевіч, настаўніца беларускай мовы Наталля Янісаўна Вайніловіч, настаўніца рускай мовы і літаратуры Марыя Валер'еўна Пятрашка, настаўнік фізікі Леанід Рыгоравіч Марковіч, настаўнік фізкультуры Юрый Уладзіміравіч Бобр, настаўнік матэматыкі Уладзімір Андрэевіч Машчэнскі, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Лера Мікітаўна Рубашная, настаўнік інфарматыкі Ірына Юр'еўна Шалатоніна, псіхолаг Наталля Рамуальдаўна Ягорава, дворнік Леанід Антонавіч Маліноўскі, камендант Сямён Аляксандравіч Быкаў, прыбіральшчыца Валянціна Віктараўна Чучвага.

Прыйшлі павіншаваць свой ліцэй і выпускнікі, цяперашнія студэнты фізічнага факультэта БДУ. Найбольш спадабаўся зале жартаўлівы нумар — прамы радыёрэпартаж з паядынку па боксу паміж Краўцэвічам і Варанцом.

Апагеем вечара стаў апошні нумар, які падрыхтавалі настаўнікі. Яны прадставілі сучасную інсцэніроўку казкі "Муха-цакатуха". Атрымалася вельмі цікава і весела. Думаецца, што ліцэістам сапраўды пашанцавала з такімі настаўнікамі.

## Без спорту нематчыма

А ў суботу 10-я і 11-я класы ў зале спорткомплекса БДУ вырашалі, хто з іх мацнейшы ў эстафетах. Трэба адзначыць, што навучэнцы, мабыць, не адзін дзень трэніраваліся ў спартыўных залах бегаць, скакаць, кувыркацца, бо каб вызначыць больш спрытных, спатрэбілася нават дадатковая эстафета. З невялікай перавагай перамаглі старэйшыя.

Выступілі і каратысты. Юрый Разанаў, вучань 10-га класа, майстар спорту, чэмпіён Беларусі і Еўропы, карычневы пояс, прывёў на паказальныя выступленні сваіх не менш знакамітых у каратэ сяброў — Аляксандра і Уладзіміра Слюсараў, чэмпіёнаў Беларусі і Еўропы, карычневыя паясы, Аляксандра Булачова, чэмпіёна Беларусі, прызёра чэмпіяната Еўропы.

Не засталіся ўбаку і жанглёры гірамі. Прадставілі сваю праграму майстар спорту па армрэстлінгу, чэмпіён Беларусі Дзяніс Семяніда і майстар спорту па гірах, чэмпіён Беларусі Дзмітрый Баркан.

Спартыўнае свята працягвалася ўвесь дзень. Перацягвалі канат як хлапцы, так і дзяўчаты, як навучэнцы, так і выкладчыкі. Гулялі ў баскетбол, плёскаліся ў басейне.

*Вольга* **КАЗДЗЕРКА**



*На фотаздымках:* абаяльныя ліцэісты з ансамбля «Глорыя».

СУПЕРШОЎ

# ПАЦАЛУНАК-99

Сусветнае супершоў "Пацалунак", на якое запрашаюцца толькі закаханыя, пройдзе 14 лютага, у дзень святога Валянціна, у спартыўным комплексе "Уручча". Мэта сустрэчы арыгінальная, але вельмі простая — устанаўленне сусветнага рэкорду па самым масавым пацалунку на нашай планеце. Рэкорд будзе ўстанаўлівацца не па працягласці пацалункаў, а па колькасці ўдзельнікаў.

У ліку арганізатараў гэтага унікальнага мерапрыемства — міжнародны клуб рэкардсменаў сусветнай Кнігі рэкордаў Гінеса "Інтэрстронг", Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь, расійская газета "Труд", Радыё Расіі, радыё Рокс і "Народная газета".

На прэсс-канферэнцыі ў Доме прэсы прадстаўнік міжнароднага клуба рэкардсменаў Кнігі рэкордаў Гінеса ў Беларусі паэт і кампазітар Мікалай Траццякоў паведаміў аб гісторыі правядзення падобных мерапрыемстваў. Дарэчы, сам ён уладальнік двух залатых медалёў "Кнігі рэкордаў Гінеса". Гэтых узнагарод Мікалай Траццякоў быў удастоены за самы працяглы канцэрт — 5 выступленняў на працягу 15 гадзін.

Упершыню сусветнае дасягненне для "Кнігі рэкордаў Гінеса" па самым масавым пацалунку ўстанавілі студэнты Мейнскага універсітэта з горада Арона (ЗША) 14 лютага 1996 года. Было зарэгістравана 1420 пар, якія абменьваліся пацалункам (2840 чалавек).

Спробу пабіць рэкорд здзейснілі ў 1997 годзе масквічы. Але яна аказалася няўдалай — на віншаванні дня нараджэння газеты "Московский комсомолец" у Лужніках масавы пацалунак прадэманстравалі ўсяго толькі 508 пар.

І вось на незвычайны сусветны рэкорд зрабілі замах мінчане. Арганізатары беларускага супершоў да гэтай падзеі рыхтуюцца вельмі сур'ёзна. Пройдзе яно ў суправаджэнні вялікага эстраднага канцэрта з удзелам маладых, але ўжо вядомых артыстаў. У ім таксама прымуць удзел шматкратны чэмпіён Алімпійскіх гульняў Аляксандр Мядзведзь, іншыя вядомыя спартсмены і артысты, дзеячы культуры і мастацтва, студэнты і працоўная моладзь, а таксама прадстаўнікі "Інтэрстронга". Майстар міжнароднага класа па кікбоксінгу, 4-кратны чэмпіён СССР і краін СНД, прызёр Кубка свету па кікбоксінгу Альберт Скараход удзельнічае ў акцыі як выканаўца уласных песень. У дзень закаханых ён выканае песню "Перавернуты свет" у стойцы на галаве. Гэта будзе яшчэ адзін афіцыйна зарэгістраваны рэкорд для кнігі Гінеса. Скараход з'яўляецца стваральнікам і трэнерам каманды беларускіх артыстаў, якія ў гэтым годзе плануюць згуляць з камандай футбольнага клуба расійскіх эстрадных зорак "Фартуна", якімі кіруе Юрый Лаза.

Рэгістрацыяй рэкорду, які плануецца ўстанавіць, будзе займацца незалежная камісія з Міжнароднага клуба рэкардсменаў "Інтэрстронг". Трыццаць спецыяльна навучаных памочнікаў-мінчан з ліку студэнтаў, якія прайшлі інструктаж па правілах рэгістрацыі падобных дасягненняў, будуць працаваць пад кіраўніцтвам масквічоў.

Заключны акорд маляўнічага прадстаўлення — устанаўленне сусветнага рэкорду па колькасці пар, якія цалуюцца адначасова з рэгістрацыяй яго камісіяй сусветнай Кнігі рэкордаў Гінеса.

*Марына АВЕРКІНА*

СЛУЖБА 03

# РАТУЙЦЕСЯ АД ГРЫПУ ЎЦЁКАМІ

Другога лютага ў Беларусі афіцыйна аб'яўлена аб пачатку эпідэміі грыпу. Большасць кантрольных гарадоў да гэтага часу выйшла на эпідэмічны ўзровень захворвання, які ў пяць разоў перавышае звычайны. У выхадныя, якраз у дзень святога Валянціна, чакаецца пік эпідэміі. А працягнецца яна, паводле папярэдніх падлікаў, пяць-шэсць тыдняў. Зрэшты, медыкі чакалі грып яшчэ са снежня. Проста надвор'е было незвычайна цёплым для зімы. На гэты раз хвароба завітала да нас з захаду, з тэрыторыі Польшчы і Калінінградскай вобласці. Пакуль зафіксаваны вірус тыпу А. Гэта стары знаёмы: ён наведваўся і ў мінулым, і ў пазамінулым годзе, калі хварэла ад 15 да 20 працэнтаў насельніцтва. Таму сёння медыкі глядзяць на праблему барацьбы з эпідэміяй аптымістычна. Ускладненні могуць узнікнуць толькі ў тым выпадку, калі, праходзячы па тэрыторыі Беларусі, грып тыпу А сустрэнецца з яшчэ якім-небудзь тыпам вірусу. Тады эпідэмія можа зацягнуцца на больш доўгі тэрмін. Хоць і "стары знаёмы", але паводзіць сябе вірус надта не па-сяброўску. У гэтым годзе хвароба працякае неяк вельмі цяжка: тэмпература ад 39 да 40 градусаў і з сур'ёзнымі ўскладненнямі. У першую чаргу хварэюць на грып дзеці да 14 гадоў. Вельмі цяжка пераносяць хваробу тыя, каму за 60. Але медыкі сцвярджаюць, што і ад гэтай бязлітаснай эпідэміі можна абараніцца, для чаго і праводзяцца супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы. Многія школы рэспублікі пераведзены на каранцін. Прадпрыемствы, на якіх не працуюць сродкі вентыляцыі, будуць бязлітасна штрафавацца. Перапынкі паміж сеансамі ў відовішчных установах сталі больш працяглымі. Існуе санітарная забарона на правядзенне масавых мерапрыемстваў. Урачы атрымалі дазвол на выдачу грамадзянам бюлетэняў на больш працяглы тэрмін. Дарэчы, на дапамогу старэйшым калегам прыйдуць у гэты цяжкі час студэнты-медыкі.

Сродкі прафілактыкі — здаровы лад жыцця (аказваецца, ад грыпу трэба ўцякаць на вуліцу, бо замкнёная прастора памяшканняў і грамадскага транспарту ёсць найпершым саюзнікам хваробы), часнок, цыбуля, полівітаміны. У якасці прафілактычных сродкаў супрацоўнікі Рэспубліканскага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі параілі рэмантадзін. Праўда, дзейсны ён толькі ў тых выпадках, калі вірус належыць да катэгорыі А.

Галоўная памылка ўсіх, хто захварэў на грып у больш-менш лёгкай форме, у тым, што яго лічаць крыху больш небяспечным з звычайную прастуду, якую большасць з нас імкнецца перанесці на нагах. На самой справе, ніякі гэта не гераізм — хворым дабірацца на працу і заняткі ў грамадскім транспарце. Дактары ўпэўнены, што эпідэмія скончыцца вельмі хутка, калі тыя, хто захварэў, будуць сядзець дома і чакаць урача.

*Марына АВЕРКІНА*


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Ум. друк. арк. 1
Падпісана ў друк у 12.00

11 ЛЮТАГА
Зак. 120.
Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 3, пакой 307, тэлефон 2206827.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка А. Крывадубскай